БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

# БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

## ТОМ 18

ШЧЫТНІКІ
ЯЯ
ДАДАТАК

## КНІГА I

**РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:**

**Г.П.ПАШКОЎ** (галоўны рэдактар), **В.С.АНОШКА**, **Я.М.БАБОСАЎ**, **В.К.БАНДАРЧЫК**, **М.А.БАРЫСЕВІЧ**, **В.І.БОЎШ**, **Т.Я.БУРАКОВА** (намеснік галоўнага рэдактара), **А.П.ВАЙТОВІЧ**, **І.Дз.ВАЛАТОЎСКІ**, **М.С.ВЫСОЦКІ**, **І.В.ГАЙШУН**, **А.М.ГАНЧАРЭНКА**, **Р.Г.ГАРЭЦКІ**, **В.М.ГУРЫН**, **А.М.ДАНІЛАЎ**, **В.В.ЗУЁНАК**, **М.П.КАСЦЮК**, **І.В.КАТЛЯРОЎ**, **С.Н.КНЯЗЕЎ**, **П.Д.КУХАРЧЫК**, **У.Р.ЛАТЫПАЎ**, **С.С.ЛАЎШУК**, **І.М.ЛУЧАНОК**, **Г.М.ЛЫЧ**, **Л.С.МАЛЬЦАЎ**, **А.В.МАЦВЕЕЎ**, **І.Я.НАВУМЕНКА**, **А.І.ПАДЛУЖНЫ**, **П.Ц.ПЕТРЫКАЎ**, **М.Ф.ПІЛІПЕНКА**, **У.В.РУСАКЕВІЧ**, **А.В.САБАЛЕЎСКІ**, **М.А.САВІЦКІ**, **А.Г.СЛУКА**, **М.С.СТАШКЕВІЧ**, **М.В.СТОРАЖАЎ**, **Л.М.СУШЧЭНЯ**, **А.К.ФЯДОСАЎ** (намеснік галоўнага рэдактара — адказны сакратар), **І.П.ХАЎРАТОВІЧ**, **І.П.ШАМЯКІН**, **В.П.ШАРАНГОВІЧ**.

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
2004

ночак шыракалісты, пярэсна еўрапейская, лілея кучаравая, шпажнік чарапіцавы і інш. У фауне 119 відаў наземных пазваночных жывёл, з якіх у Чырв. кнізе пустальга звычайная, зялёны дзяцел і інш. *П.І.Лабанок.*

**КУРАПА́ЦЕНКА** Валянцін Фёдаравіч (н. 18.12.1933, г. Рэчыца Гомельскай вобл.), расійскі фізік-тэарэтык. Д-р фіз.-матэм. н. (1978), праф. (1983). Засл. дз. нав. Расійскай Федэрацыі (2000). Сын Ф.К.*Курапаценкі.* Скончыў Ленінградскі ун-т (1956). З 1956 у Рас. федэральным ядз. цэнтры — Усерас. НДІ тэхн. фізікі (г. Снежынск Чэлябінскай вобл.). Адначасова з 1992 у Чэлябінскім ун-це, у 1997—99 праф. Снежынскай фіз.-тэхн. акадэміі. Навук. працы па механіцы суцэльных асяроддзяў, матэм. мадэліраванні ў фізіцы і тэхніцы. Прапанаваў метад разліку ўдарных хваль, рознасныя метады рашэння ўраўненняў гідра- і газадынамікі. Распрацаваў фіз. і матэм. мадэлі для разліку ядз. устройстваў, фіз. працэсаў пры ўздзеянні на небяспечныя для Зямлі касм. аб'екты. Прымаў удзел у распрацоўцы ядз. зброі. Дзярж. прэмія СССР 1968.

*Тв.:* Исследование прочности материалов при динамических нагрузках. Новосибирск, 1992 (разам з Б.Л.Глушаком, С.А.Новікавым); Высокоскоростное взаимодействие тел. Новосибирск, 1999 (у сааўт.). *М.М.Касцюковіч.*

Маскоўскай вобл., Расія — 16.9.1990), савецкі ваен. дзеяч. Маршал Сав. Саюза (1983), Герой Сав. Саюза (1981). У Сав. Арміі з 1937. Скончыў Арлоўскае бранятанк. (1939) і Ваенна-паліт. (1941) вучылішчы, Ваен. акадэміі бранятанк. і механізаваных войск (1951) і Генштаба (1958). У Вял. Айч. вайну ў 7-й асобнай арміі, на Варонежскім і 1-м Укр. франтах, з ліст. 1944 камандаваў танк. брыгадай. Пасля вайны — у войсках на камандных пасадах. Са жн. 1966 1-ы нам. галоўнакамандуючага Групай сав. войск у Германіі, з крас. 1968 каманд. войскамі Закаўк. ваен. акругі, з верас. 1971 галоўнакамандуючы Групай сав. войск у Германіі. З ліп. 1972 нам. міністра абароны — нач. Тылу Узбр. сіл СССР. З 1988 у Групе ген. інспектараў Мін-ва абароны СССР.

**КУРМАШО́Ў** Віктар Іванавіч (н. 10.2.1946, Мінск), бел. вучоны ў галіне электроннай тэхнікі, мікраэлектронікі, педагог. Д-р тэхн. н. (1991), праф. (1992). Вынаходнік СССР (1988). Акад. Бел. інж. акадэміі (1999). Скончыў Мінскі радыётэхн. ін-т (1969), дзе і працаваў. З 1992 дырэктар МП «Белсавін». З 1993 дырэктар Рэсп. навук.-метадычнага цэнтра «Алгарытм», з 2002 нам. ды-